

## Марыя ЛЯШУК

* * *

*І зноў я тут, у роднай хаце,
Што патанула ў вішняку.
З усмешкай сустракае маці
У сваім чыстым фартуху.*

*Сястрычка радасна пытае,
Надоўга я сюды ці не.
І брат малодшы абнімае
Малымі ручкамі мяне.*

*Я чую ціхую гамонку
На родны мне палескі лад.
І гэтак жа спявае звонка
Малы жаўрук, як год назад.*

*Усё да болю мне знаёма,
Ні з чым расстацца не магу...
Але вось сэрца, хоць і дома,
Хавае нейкую тугу.*

*Яно ірвецца ў шумны горад,
Што ўбачу зноў праз колькі дзён,
І нешта стукае з дакорам,
І верыць — там чакае Ён.*

### Дзядулю

*На сэрцы незагоеная рана,
Шчыміць як ад апёку крапівы.
Чаму пайшоў у іншы свет так рана?
Чаму цябе няма сярод жывых?*

*Дзядуля мой быў дужы і прыгожы.
Дачушак гадаваў, зямлю араў.
А ў час вайны, закляты і трывожны,
Ваяр з Палесся мір абараняў.*

*Бабулю толькі помню я, Параску.
Дзяцей на ногі ставіла адна,
Трымалася на свеце Божай ласкай,
А праца — ад відна і да відна.*

*Ды вернай заставалася Якіму.
Гаротныя міналі дні, гады.
«Навошта ты адну мяне пакінуў,
Каханы мой, прыгожы, малады?»*

*А над магілкай — дуб, як ён, магутны,
Шапоча лісцем з ветрам ва ўнісон.
Удовіна жальба і плач ледзь чутны
Не перапыняць вечны яго сон.*

*Гарыць агнём нязгоеная рана,
Пытанні — як апёкі крапівы.
Чаму пайшоў у іншы свет так рана?
Чаму даўно няма сярод жывых?*

* * *

*Ах, засыпала белай замеццю
Красавіцкую прыгажосць.
Дык чаму ж, чаму ў зорнай памяці
Ты, як некалі, званы госць?*

*Раніць позні снег, як іголкамі,
Арабінавы сэрца жар.
Дык чаму ж, чаму словы колкія
Працінаюць трывогай імшар?*

*Замарозіла кветкі раннія.
Заракацца не трэба бяды.
Дык чаму ж, чаму даўняй ранаю
І вясною былой мроіш ты?*

*Толькі сонейка тчэ красёнцамі
Яснавокія прамяні.
Дык чаму ж, чаму ў даль бясконцую
Адышлі, як сон, тыя дні?*